*М.А.БЯСПАЛАЯ*

# 2001–2005 гг.: НОВАЯ СТУПЕНЬ У НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БДУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Адным з галоўных кірункаў дзейнасці вышэйшай навучальнай установы і адным з галоўных крытэрыяў яе ацэнкі з'яўляецца навуковая работа. Для калектыву БДУ культуры і мастацтваў гэты від дзейнасці мае выключнае значэнне па многіх прычынах. Па-першае, універсітэт з'яўляецца вядучай навучальнай установай у галіне культуры, што прадугледжвае наяўнасць значных дасягненняў у навуцы. Па-другое, універсітэт забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў па 16 спецыяльнасцях і больш чым 47 спецыялізацыях, і гэта патрабуе пастаяннага творчага ўзаемадзеяння тэорыі і практыкі. Па-трэцяе, навукоўцы універсітэта працуюць у межах унікальных спецыяльнасцей, кадры па якіх рыхтуюцца толькі ў нашым універсітэце, і таму менавіта яны забяспечваюць гэтыя спецыяльнасці вучэбнымі матэрыяламі, неабходнымі для навучальнага працэсу.

Навуковая дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў за апошнія пяць гадоў прадаўжала развівацца ў рэчышчы тэндэнцый, усталяваных у нашай ВНУ з дня яе адкрыцця ў 1975 г. Пэўныя карэктывы адбываліся ў сувязі з вызначэннем дзяржаўных прыярытэтаў, прыняццем адпаведных пастаноў і палажэнняў. На першы план сталі вылучацца праблемы ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі з мэтай ажыццяўлення пераемнасці пакаленняў, аптымізацыі кадравага складу вышэйшых навучальных устаноў, распрацоўкі тэматыкі навуковых работ у адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі і патрэбамі практыкі.

Важным крокам у вырашэнні гэтых праблем мы лічым арганізацыю навукова-даследчай работы сярод студэнтаў, што дазваляе ажыццяўляць адбор самых здольных навучэнцаў да гэтай дзейнасці ўжо на малодшых курсах. У БДУ культуры і мастацтваў навуковая работа студэнтаў пачынаецца ў агульнауніверсітэцкіх, факультэцкіх навуковых гуртках, у гуртках, створаных на кафедрах. Да першых з іх адносіцца навуковае аб'яднанне "Studia-humanitatis", якое ў 2002 г. за актыўную навуковую дзейнасць атрымала прэмію Спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў і на сродкі якога быў выдадзены зборнік студэнцкіх творчых работ "Альфабэт". Да агульнауніверсітэцкіх адносіцца і суполка "БУКет", праца якой адлюстроўваецца ў рэгулярным выпуску зборнікаў твораў студэнтаў –удзельнікаў суполкі.

Як важнейшы этап у падвядзенні вынікаў студэнцкай навуковай работы мы разглядаем штогадовыя навуковыя канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Яны адбываюцца заўсёды ў красавіку і прысвечаны праблемам беларускай культуры. Падчас пленарнага пасяджэння і работы секцый заслухоўваюцца студэнцкія даклады, што дазваляе адабраць лепшыя для такой формы публікацый, як дэпаніраванне, а таксама звярнуць увагу на найбольш здольных і накіроўваць іх навуковую дзейнасць, каб пасля заканчэння універсітэта яны былі падрыхтаваны да больш глыбокай навуковай работы і свядома вызначылі свой шлях у навуку.

Завяршэннем гадавога цыкла студэнцкай навуковай дзейнасці з'яўляецца ўдзел лепшых студэнцкіх навуковых работ у штогадовым рэспубліканскім конкурсе. У 2005г. на конкурс былі прадстаўлены 56 студэнцкіх работ. З іх 13 атрымалі першую катэгорыю, 11– другую і 18 – трэцюю. Адзін студэнт нашай ВНУ стаў лаўрэатам конкурсу.

Наступны важны этап у фарміраванні кадраў вышэйшай кваліфікацыі звязаны з дзейнасцю аспірантуры. За 2001–2005 гг. яе скончылі 80 чалавек. Становяцца аспірантамі лепшыя выпускнікі, якія праявілі здольнасць да навуковай работы, маюць навуковыя публікацыі, вопыт навукова-даследчай работы па тэмах кафедры, удзельнічаюць у навуковых канферэнцыях.

Падрыхтоўка аспірантаў адбываецца па пяці навуковых спецыяльнасцях: бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства; тэорыя і гісторыя мастацтва; тэорыя і гісторыя культуры; тэорыя і гісторыя мастацтва; музея- знаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб`ектаў.

Тэматыку кандыдацкіх дысертацый вызначалі праблемы культуры і мастацтва Беларусі і замежжа.

Навуковае кіраўніцтва аспірантамі і суіскальнікамі ажыццяўляюць вядомыя навукоўцы універсітэта і рэспублікі, дактары навук, прафесары Я.Д.Грыгаровіч, М.А.Мажэйка, А.І.Смолік,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.А.Бяспалая, В.М.Наумчык, І.В.Марозаў, Р.В.Грабеннікаў, А.П. Грыцкевіч, Э.К.Дарашэвіч, У.Ф.Мартынаў, Ю.М.Чурко, А.В.Марозаў, Я.М.Бабосаў, Н.П.Яканюк, Г.С.Мішуроў, В.П.Пракапцова, В.Е.Ля-вончыкаў, вядучыя кандыдаты навук, дацэнты М.Л.Кузьмініч, А.А.Макарава, С.В.Зыгмантовіч, М.А.Яцэвіч, Н.А.Ляйко, Л.Ф.Голікава, І.М.Грамовіч, А.Л.Карацееў, Л.А.Дзямешка, В.В.Калацэй, Н.У.Клімянкова, Л.І.Казлоўская, І.А.Малахава і інш.

Вынікам мэтанакіраванай работы аддзела аспірантуры, які са дня яе адкрыцця ўзначальвае Т.П.Велішкевіч, цеснага супрацоўніцтва аддзела з выпускаючымі кафедрамі, навуковымі кіраўнікамі стала абарона ў 2001–2005 гг. 21 кандыдацкай дысертацыі.

Дзейнасць дактарантуры універсітэта, што працуе па тых жа навуковых спецыяльнасцях, пацвярджаецца чатырма абароненымі доктарскімі дысертацыямі.

На працягу 2001–2005 гг. плённа працавалі тры спецыялізаваныя саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па ўсіх навуковых спецыяльнасцях універсітэта, тым самым цыкл падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі набыў завершаны характар. У іх за гэты перыяд навукоўцамі універсітэта і рэспублікі абаронены 35 дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара і кандыдата навук.

Навуковыя кірункі, развіццё якіх забяспечваецца калектывам універсітэта, з’яўляюцца прыярытэтнымі ў галіне культуры. Асабліва важнае значэнне набываюць праблемы, звязаныя з функцыяніраваннем сацыякультурнай сферы. Сярод галоўных задач, што вырашаюцца навукоўцамі універсітэта, можна вылучыць пытанні арганізацыі, метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўстановах гэтай сферы – Дамах культуры, бібліятэках, музеях, аматарскіх творчых аб’яднаннях і інш. Ва універсітэце працуюць вядучыя вучоныя рэспублікі ў гэтай галіне. Доктар педагагічных навук, прафесар, рэктар універсітэта Я.Д.Грыгаровіч сфарміравала навуковую школу і кіруе даследаваннямі ў рамках навуковай спецыяльнасці “тэорыя, методыка і арганізацыя СКД”. У склад навуковай школы ўваходзяць аўтарытэтныя спецыялісты сацыякультурнай сферы, кандыдаты педагагічных навук, дацэнты Л.І.Казлоўская, А.А.Макарава, С.Б.Майсяйчук, М.М.Каралёў, Н.У.Самерсава, І.А.Малахава і інш.

Адзіная ў рэспубліцы школа ў галіне культуралогіі таксама сфарміравалася ў нашым універсітэце. Яе стваральнікам з’яўляецца першы доктар культуралогіі, прафесар А.І.Смолік. Плённа ў гэтай галіне працуюць доктар культуралогіі, прафесар У.Ф.Мартынаў, кандыдат гістарычных навук, прафесар П.Р.Ігнатовіч, кандыдаты культуралогіі, дацэнты Ю.В.Чарняўская, Ю.Г.Болатава і інш.

Праблемамі кампаратывістыкі ў мастацтвазнаўстве займаецца навуковая школа, кіраўніком якой з’яўляецца доктар мастацтвазнаўства, прафесар В.П.Пракапцова, а сярод яе пачынальнікаў узгадаем імя вядомага навукоўца, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Г.І.Барышава.

Навуковая школа ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, якую ўзначальвае доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў, таксама з’яўляецца адзінай у рэспубліцы. Плённая дзейнасць па падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі садзейнічала абароне кандыдацкіх дысертацый А.Багарэвіч, Л.І.Доўнар і іншымі, а таксама доктарскай дысертацыі Р.С.Матульскім.

Наяўнасць навуковых школ, якія займаюць вядучае месца ў сферы культуры, дапамагае актыўнай і глыбокай распрацоўцы праблемных пытанняў, якаснаму кіраўніцтву падрыхтоўкай маладых кадраў, павышэнню навуковага статусу БДУ культуры і мастацтваў.

Своеасаблівай ілюстрацыяй навуковых дасягненняў універсітэта з’яўляецца навукова-метадычны часопіс “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў”, які выдаецца з 2002 г. Кожны нумар складаецца з артыкулаў вядомых навукоўцаў універсітэта, дактарантаў, аспірантаў, пры- свечаных важнейшым праблемам у межах навуковых кірункаў універсітэта.

Прынята лічыць, што праца выкладчыка складаецца з трох частак – выкладання, метадычнай работы і навуковай работы. Калектыў універсітэта за мінулыя пяць гадоў працаваў плённа і эфектыўна над выкананнем 26 навукова-даследчых тэм. Яны прысвечаны тэарэтычным праблемам развіцця культуры, яе прыкладным аспектам, пытанням практычнага выкарыстання дасягнутых вынікаў, якія актыўна ўкараняліся ў вучэбны працэс і практыку ўстаноў сацыякультурнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За 2001–2005 гг. навуковыя і творчыя колы рэспублікі змаглі азнаёміцца і даць ацэнку ідэям, што былі выкладзены навукоўцамі нашага універсітэта ў 46 манаграфіях, 73 падручніках і вучэбных дапаможніках, 7 хрэстаматыях, звыш 1590 навуковых артыкулах і інш. У ліку манаграфій "Народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі ў Беларусі: вопыт сістэмнага аналізу" Н.П.Яканюк (2001 г. – 16,6 ум. друк. арк.); "Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект" Я.Д.Грыгаровіч (2002 г. – 23, 5 ум. друк. арк.); "Художественно-творческая деятельность детей-инвалидов" С.Б.Майсяйчук (2002 г. – 7 ум. друк. арк.); "Народна-інструментальнае мастацтва: традыцыі і сучаснасць" Г.С.Мішурова (2002 г. – 13 ум. друк. арк.); "Бібліятэка як сацыяльны інстытут" Р.С.Матульскага (2002 г. – 21,7 ум. друк. арк.); "Сімволіка беларускай народнай культуры" І.І.Крука (2003 г. – 23 ум. друк. арк.); "Фальклорны тэатр беларусаў: праблемы паэтыкі і эстэтыкі (на матэрыяле XV111–XX стст." І.І.Сучкова (2004 г. – 18 ум. друк. арк.).

Важную ролю ў пашырэнні навуковых кантактаў і азнаямленні навуковай грамадскасці з праблемамі, якія вырашае калектыў універсітэта, адыгрывае ўдзел нашых выкладчыкаў у навуковых канферэнцыях – міжнародных, рэспубліканскіх, універсітэцкіх. За перыяд 2001–2005 гг. ва універсітэце былі праведзены 29 навуковых, навукова-метадычных канферэнцый і семінараў. Сярод іх адзначым канферэнцыі на наступныя тэмы: "Актуальныя праблемы развіцця духоўнай культуры Беларусі ў пачатку XXI ст." (лістапад 2002 г.); "Нематэрыяльная культурная спадчына: праблемы і перспектывы" (чэрвень 2002 г.), "Міжнародны вопыт сацыяльна-педагагічнай работы з маргінальнай моладдзю" (красавік 2004 г.), "Нематэрыяльная культурная спадчына славянскіх народаў: праблемы збірання, зберажэння, перспектывы комплекснага вывучэння" з удзелам прадстаўнікоў ЮНЕСКА, Расіі, Украіны, Малдовы, Грузіі, Арменіі, Азербайджана (сакавік 2004 г.), "Культура і творчасць: сучасны стан і перспектывы", прысвечаная 30-годдзю БДУ культуры і мастацтваў (кастрычнік 2005 г.), "Бібліятэкі і музеі ў адзінай прасторы інфармацыі і культуры" (кастрычнік 2005 г.), "Краязнаўства і патрыятычнае выхаванне моладзі" (сакавік 2005 г.), "Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі" (прысвечана 60-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй, красавік 2005 г.).

Традыцыйна кожны год у маі ва універсітэце праводзіліся Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, па выніках якіх выдаваліся зборнікі навуковых дакладаў.

У разглядаемы перыяд выкладчыкі універсітэта прымалі ўдзел у міжнародных форумах рознага кшталту ў Расіі, на Украіне, у Літве, Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Арменіі, Карэі, Даніі і іншых краінах. Удзельнікамі гэтых форумаў былі прадстаўнікі розных навуковых школ: прафесары Я.Д.Грыгаровіч, М.А.Бяспалая, Ю.М.Чурко, А.П.Грыцкевіч, В.Е.Лявончыкаў, А.І.Смолік, В.П.Пракапцова, А.В.Сабалеўскі, В.М.Наумчык, А.П.Грыцкевіч, Л.І.Казлоўская, М.А.Яцэвіч, П.А.Гуд, М.Л.Кузьмініч, А.У.Марозаў, дацэнты С.В.Гуткоўская, У.К. Зяневіч, І.П.Клімаў, А.У.Пазнякоў і інш.

Своеасаблівым прызнаннем навуковага аўтарытэту універсітэта з'яўляецца супрацоўніцтва з навучальнымі і навуковымі ўстановамі і арганізацыямі рэспублікі і замежжа. Шырока ажыццяўлялася навуковае супрацоўніцтва з буйнымі навуковымі інфармацыйнымі і культурнымі цэнтрамі краіны, такімі як Інстытут мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору імя К.Крапівы, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Беларуская акадэмія музыкі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, а таксама з замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і арганізацыямі Расіі, Украіны, Літвы, ЗША, Германіі, Польшчы, Карэі, Францыі, Даніі, Англіі і інш.

Сумесна з названымі і іншымі ўстановамі выконваюцца навуковыя тэмы, праводзяцца навуковыя, навукова-практычныя канферэнцыі і семінары і іншыя мерапрыемствы, рэдагуюцца і рэцэнзуюцца навуковыя зборнікі, падручнікі і часопісы. Напрыклад, прафесар П.Р.Ігнатовіч з'яўляецца членам каардынацыйнага савета Міністэрства адукацыі па арганізацыі маніторынгу якасці адукацыі і выхавання навучэнцаў Рэспублікі Беларусь, прафесар Ю.М.Чурко – членам рэдакцыйнай калегіі часопісаў "Балет" (Расія) і "Мастацтва" (Рэспубліка Беларусь). Прафесар А.П.Грыцкевіч прымае ўдзел у дзейнасці Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, у стварэнні Беларускай энцыклапедыі і энцыклапедычнага даведніка "Рэлігія і царква

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

на Беларусі", з'яўляецца членам рэдакцыйнай калегіі Беларускай энцыклапедыі і галоўным рэдактарам энцыклапедыі "Вялікае княства Літоўскае". Дацэнт Л.Ф.Голікава працягвала навуковае супрацоўніцтва з аддзелам музычнага мастацтва ІМЭФ НАН Беларусі. Яна з'яўлялася адным з сааўтараў сумеснага даследавання "Традыцыі і пераемнасць развіцця беларускай музыкі (2001–2004 гг.)"гэтага інстытута, членам рэдакцыйнай калегіі часопіса "Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання", адным з аўтараў мнагатомнага выдання "Беларусы", прымала ўдзел у напісанні другога тома выдання "Фарміраванне і развіццё беларускай прафесійнай музыкі". Дацэнт І.А.Алексніна з'яўляецца членам савета па абароне дысертацый пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі.

Цеснае і плённае супрацоўніцтва ажыццяўляецца паміж Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй РБ і БДУ культуры і мастацтваў. Дактары навук, прафесары У.Ф.Мартынаў, Э.К.Дарашэвіч, В.П.Пракапцова, М.А.Мажэйка, М.А.Бяспалая, А.У.Марозаў, Ю.М.Чурко, дацэнт Л.Ф.Голікава з'яўляліся членамі экспертных саветаў па культуралогіі, мастацтвазнаўстве, філасофскіх, гістарычных і філалагічных навуках.

Прызнаннем высокага навуковага патэнцыялу калектыву універсітэта з'яўляецца ўдзел нашых навукоўцаў у выкананні трох заданняў у рамках Дзяржаўнай праграмы "Развіццё і функцыянаванне культуры Беларусі ў 2001–2005 гг.", заданняў у межах рэалізацыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі РБ і Дзяржаўнай праграмы інфарматызацыі РБ на 2003–2005 гг. і на перспектыву да 2010 года "Электронная Беларусь".

На падставе Пратакола даручэнняў Прэзідэнта РБ у БДУ культуры і мастацтваў створаны і актыўна працуюць дзве навукова-творчыя лабараторыі – беларускіх народных музычных інструментаў і традыцыйныя рамёствы беларусаў.

Навукова-творчая лабараторыя традыцыйных рамёстваў беларусаў ажыццяўляла даследчую дзейнасць па праграме аднаўлення і развіцця традыцыйных тэхналогій беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Даследаваны асаблівасці развіцця традыцыйнага народнага мастацтва на розных гістарычных этапах, зроблены тэарэтычны аналіз матэрыялаў па ганчарстве і кераміцы, ткацтве, саломапляценні, роспісе, габелену. Вывучаны маладаследаваныя і страчаныя тэхналогіі беларускага народнага мастацтва з мэтай іх аднаўлення. Праведзены навуковыя экспедыцыі ў Польшчу і Літву, што дало магчымасць выявіць асаблівасці развіцця беларускага народнага мастацтва ў памежных рэгіёнах яго бытавання. Па матэрыялах даследаванняў у рамках дзейнасці лабараторыі навуковыя артыкулы апублікаваны ў часопісах і зборніках. Калектыў лабараторыі працуе над манаграфіяй, у якой знойдуць адлюстраванне цікавыя матэрыялы, новыя знаходкі ў развіцці беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, будуць паказаны вынікі творчай дзейнасці лабараторыі за пэўны перыяд яе існавання.

Лабараторыя беларускіх народных музычных інструментаў займалася навуковай, метадычнай, мастацка-творчай, эксперыментальнай работай. Для выкарыстання вядомых беларускіх народных музычных інструментаў у сучаснай канцэртнай практыцы супрацоўнікі лабараторыі па старажытных узорах адраджалі тэхніку вырабу старажытных музычных інструментаў, даючы ім новае творчае жыццё. Акрамя гэтага, навуковыя супрацоўнікі лабараторыі на падставе вывучэння і аналізу магчымасцей выканання на беларускіх народных інструментах падрыхтавалі і выдалі "Школу ігры на беларускіх народных духавых інструментах" у дзвюх частках (аўтары І.А.Мангушаў, А.Я.Крамко, У.М.Гром, аб'ём 54 ум. друк. арк.); вучэбныя дапаможнікі "Музычная скарбонка" (аўтар А.І.Мангушаў, аб'ём 10 ум. друк. арк.); "Грай, мая дудка!"аб'ём 11,0 ум. друк. арк. і "Беларускія народныя духавыя інструменты" аб'ём 4,0 ум. друк. арк. (аўтар А.Я.Крамко).

Супрацоўнікамі бібліятэкі універсітэта і названай лабараторыі сумесна з Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры была арганізавана і праведзена навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Беларускія народныя музычныя інструменты ў кантэксце сучаснай мастацкай культуры: эстэтыка, творчасць (выканальніцкая, кампазітарская), педагогіка, тэхналогія", у рабоце якой прынялі ўдзел вядомыя вучоныя, выкладчыкі, кампазітары, выканаўцы, майстры па вырабе беларускага народнага інструментарыя. Былі разгледжаны пытанні, звязаныя з праблемамі існавання беларускіх народных музычных інструментаў у сучаснай нацыянальнай музычнай культуры. На базе лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў працуе семінар, дзе абмяркоўваюцца праблемы развіцця народных інструментаў.

Мы акрэслілі толькі галоўныя кірункі навуковай дзейнасці супрацоўнікаў універсітэта ў 2001–2005 гг., аналіз якіх дазваляе зрабіць высновы аб існаванні дастаткова прадуманай і эфектыўнай сістэмы, што ўключае розныя ступені падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, навукова-даследчыя дасягненні выкладчыкаў універсітэта, дзейнасць навукова-творчых лабараторый, выдавецкую дзейнасць. Ва універсітэце працягваецца праца па азначаных і новых напрамках. Да вельмі важных у ліку іх мы адносім актыўную прапаганду вынікаў нашых навуковых даследаванняў па актуальных праблемах сацыяльна-культурнай дзейнасці, іх укараненне ў практыку сацыякультурных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ